«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

За гвалт над супрацоўнікам міліцыі судзяць Юзафа Нямеру, пацярпелага схавалі за шырмай

04.11.2020 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, сілавыя структуры



Юзаф Нямера ў судзе. Фота: Гарадзенская Вясна.

У Беларусі суды пачалі разгляд крымінальных спраў па артыкуле 364 Крымінальнага кодэкса, звязаных з гвалтам, альбо пагрозай прымянення гвалту ў дачыненні да супрацоўніка органаў унутраных спраў.

З пачатку кампаніі па выбарах прэзідэнта Беларусі 2020 года, больш чым за пяць месяцаў у краіне заведзена больш за 700 крымінальных спраў супраць удзельнікаў прэзідэнцкай гонкі, актывістаў іх штабаў, удзельнікаў мірных акцый пратэсту, якія адбыліся пасля выбарчай кампаніі. Частка з іх па артыкулах 364 (Гвалт альбо пагроза прымянення

гвалту ў дачыненні да супрацоўніка органаў унутраных спраў) і 363 КК РБ (Супраціў супрацоўніку органаў унутраных спраў або іншай асобе, якая ахоўвае грамадскі парадак).

У судзе Кастрычніцкага раёну Гародні 3 лістапада пачаўся суд па крымінальнай справе 63-гадовага **Юзафа Нямеры.** Гарадзенца вінавацяць адразу па двух артыкулах крымінальнага кодэксу - 342 (Арганізацыя або актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак) і 364 (Гвалт альбо пагроза прымянення гвалту ў дачыненні да супрацоўніка органаў унутраных спраў).

Працэс вядзе суддзя **Вольга Бекушава**.

Па інфармацыі “Гарадзенскай Вясны”, Юзаф Нямера ўдзельнічаў у маршы пратэсту 6 верасня і бараніў жанчыну ад жорсткіх дзеянняў АМАПу. Пры тым ён нейкім чынам штурхануў аднаго з міліцыянтаў.

На працэсе "пацярпелага" пасадзілі за адмысловую шырму, каб ніхто не мог бачыць яго твару.

У першы дзень разгляду справы суддзя апытала абвінавачанага і пацярпелага.

Пацярпелы супрацоўнік міліцыі заявіў у судзе, што яму запэцкалі службовае адзенне і таму заявіў матэрыяльную прэтэнзію ў памеры 1000 рублёў.

Таксама быў апытаны адзін пяці заяўленых сведкаў, іншыя сведкі пакуль не з'явіліся на суд. Таксама былі разгледжаны матэрыялы судовай справы.

Працэс працягнецца 4 лістапада а 14.45. У гэты дзень будуць апытвацца іншыя сведкі.



Для слонімца, які заступіўся за дзяўчыну і парваў кашулю міліцыянту, пракурор запрасіў два гады "хатняй хіміі"

У судзе Слонімскага раёна завяршаецца разгляд крымінальнай справы супраць мясцовага жыхара Максіма Кучынскага, якога вінавацяць у гвалтоўных дзеяннях супраць супрацоўніка міліцыі

Опубликовать







Мінчука асудзілі за ўдзел у адной акцыі пратэсту. У якасці доказа выкарысталі яго "аператыўнае апытанне"

На цэнтральных плошчах і каля рэдакцый. Дзе на Міншчыне забаронена збіраць подпісы па вылучэнні кандыдатаў

Праваабаронцы рыхтуюць дапаможнік пра мірныя сходы для беларусаў і беларусак замежжа

Палітзняволеную ўраджэнку Украіны асудзілі па "справе карагодаў" у Брэсце



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

Агляд навінаў палітвязняў з 5 па 13 снежня

"Чалавек выгаворвае табе ўсе свае страхі". Як аказваюць медыцынскую і псіхалагічную дапамогу асуджаным да смяротнага пакарання

"Пусціўся ў слэм пад "Груз", а ў галаве — ўспаміны пра тыдзень у халодным ШІЗА..." Вялікая размова з экс-следчым, асуджаным па "справе карагодаў"

У анкахворага палітвязня прагрэсуе хвароба. Ён праходзіць курсы хіміятэрапіі ў турэмнай лякарні



ГАЛОЎНАЕ



Лідар гурта "Дети хрущёвок", песні якога прызналі "экстрэмісцкімі", распавёў пра пераслед за сваю творчасць



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Як былыя палітвязні пасля вызвалення бароняць правы зняволеных

Судзяць мужчыну, які падтрымліваў дабраахвотнікаў ва Украіне

Месцы, забароненыя для пікетавання: у Баранавічах – праблемна і лайт-рэжым на раёне

Як рыхтуюцца да адзінага дня галасавання на Шчучыншчыне?

Крымінальная справа супраць супрацоўнікаў тэлеканала, ліквідацыя літоўскага клуба: хроніка пераследу 13-14 снежня (дапоўнена)

Агляд навінаў палітвязняў з 5 па 13 снежня

За "балабола" на адрас Лукашэнкі ў "чаце Барадача" – адзін год калоніі

Катаванні позай, пагроза пазбаўлення бацькоўскіх правоў. Як

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Лістапад 2023



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022



ВЫДАННІ

Абмежаванне свабоды



Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА



















СЯБРОЎСТВА







E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY